На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

№№7–8
(3137–3138)

19–21 студзеня 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ГАРАЧАЯ ТЭМА

Нафта. Грошы. Палітыка

Можна збіцца з ліку, колькі дзён першы віцэ-прэм'ер беларускага ўрада **Уладзімір СЯМАШКА** сядзеў нагатове, рыхтуючыся ў любы момант вылецець у Маскву для падпісання пагаднення аб умовах пастаўкі нафты, але так і не вылецеў. Нават ліст Аляксандра Лукашэнкі да Дзмітрыя Мядзведзева не дапамог паскорыць працэс перамоў.

На гэтым фоне навін з "нафтавага фронту" стала меней, але яны ўсё больш трывожныя.

Па-першае. Эпісталярны жанр набывае папулярнасць у адносінах паміж дзвюма сталіцамі. Першы віцэ-прэм'ер расійскага ўрада **Ігар СЕЧЫН** накіраваў ліст-папярэджанне свайму беларускаму калегу: каб выкараніць нават думку пра тое, што Беларусь здолее шантажыраваць Расію павелічэннем кошту транзіту нафты. "Падумайце, перш чым зрабіць", — параіў Сечын. Як патлумачыў СМІ прэс-сакратар расійскага прэм'ера **Дзмітрый ПЯСКОЎ**, у лісце адназначна заяўлена, што ў выпадку павелічэння кошту транзіту Беларусь увогуле будзе пазбаўлена квоты на бяспошлінную нафту. Пакуль, нагадаем, Расія пагаджаецца паставіць нам 6,3 мільёна тон нафты без пошліны, што на год забяспечвае патрэбы эканомікі Беларусі.

Другая трывожная навіна. Федэральная мытная служба Расіі афіцыйна паведаміла, што з 1 студзеня не толькі на нафту, але і на нафтапрадукты, якія пастаўляюцца ў Беларусь, мытная пошліна налічваецца ў памеры 100%. Страты падлічыць лёгка. У мінулым годзе Беларусь экспартавала з Расіі больш за 3 мільёны тон нафтапрадуктаў. Сярэдні кошт кожнай тоны склаў 317 долараў. А на экспарт тую ж тону мы прадавалі ў сярэднім па 430 долараў, іншымі словамі, мелі больш за 100 долараў "навару" на кожнай тоне нафтапрадуктаў, альбо больш за 300 мільёнаў долараў зарабілі проста з паветра. І вось "бізнес" перакрыты. Крыўдна? Не тое слова...

Нарэшце ўжо зараз значна скараціліся пастаўкі расійскай нафты на беларускія НПЗ. Як паведамляюць прадстаўнікі "Транснафты", яны ўжо цяпер складаюць толькі чацвёртую частку ад былых аб'ёмаў. Больш за тое, "Транснафта" афіцыйна звярнулася да расійскіх нафтаэкспарцёраў з прапановай накіраваць аб'ёмы сыравіны, якія рэзерваваліся для беларускіх заводаў, у польскі порт Гданьск. Па інфармацыі агенцтва "Рэйтэр", расійскія кампаніі пачалі ўжо пеpанакіроўваць нафту с беларускага напрамку на іншыя. Сусветныя СМІ, спасылаючыся на розных экспертаў, у адзін голас сцвярджаюць, што беларускія НПЗ знаходзяцца на мяжы спынення. І толькі беларускія афіцыйныя СМІ склалі крылы і ўвогуле абыходзяць нафтавую тэму. Не робяць гучных заяў і беларускія афіцыйныя асобы, бо спыненне паставак нафты ў сярэдзіне зімы (будзем спадзявацца, што да гэтага не дойдзе, хаця пагроза ёсць) — гэта сапраўды калапс.

"Лукашэнка паставіў Пуціна ў няёмкае становішча, адмовіўшыся прызнаваць дзве марыянетачныя дзяржавы, якія створаны пры падтрымцы Расіі ў Грузіі (Паўднёвую Асецію і Абхазію). Таму не дзіўна, што гэтай зімою Пуцін вырашыў пакараць менавіта Беларусь", — лічыць амерыканскае выданне Washington Post. Ці сапраўды прычына ў гэтым, можна толькі здагадвацца. Але адна выснова з сёлетняй нафтавай вайны здаецца бясспрэчнай: ні дзяржаве, ні кожнаму канкрэтнаму чалавеку нельга вечна разлічваць на халяву, бо рана ці позна яна скончыцца. Альбо такую цану ў выніку заплаціш, што дармавое апынецца залатым.

Алена НОВІКАВА.

ТЫМ ЧАСАМ

Паміж Беларуссю і Расіяй можа ўзнікнуць новая канфліктная тэма. У панядзелак Аляксандр Лукашэнка выказаў занепакоенасць "у сувязі з інфармацыяй, якая паступае з беларуска-расійскай мяжы". Пра гэта ён паведаміў перад дакладам старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Ігара Рачкоўскага аб выніках аператыўна-службовай дзейнасці органаў пагранслужбы.

"Насуперак нашым дамоўленасцям нібыта адбываецца ўзмацненне кантролю на мяжы", — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён папрасіў праверыць гэту інфармацыю і паведаміць пра вынікі.

Мясцовыя выбары прызначаны на 25 красавіка

Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў у панядзелак, 18 студзеня. Нагадаем, што большасць палітычных партый ужо заявілі аб сваім актыўным удзеле ў гэтай выбарчай кампаніі.

Дарэчы, напрыканцы гэтага года павінна пачацца і прэзідэнцкая выбарчая кампанія. Арыенціровачнай датай прэзідэнцкіх выбараў лічыцца люты 2011 года.

Кампаній шмат, але ці будуць сапраўдныя выбары — пытанне адкрытае.

БЛІЦ

Зянон Пазьняк заклікае байкатаваць чарговыя прэзідэнцкія выбары. Вы згодны з гэтым?

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

— Калі да канца не будуць ясныя правілы гульні, па якіх будуць праводзіцца прэзідэнцкія выбары, то гэтае пытанне можна будзе абмяркоўваць...

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ, старшыня сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада):

— Не, не згодны. Я больш прагматычны палітык. Ідэю Пазьняка ў Беларусі не ажыццявіць. Байкот магчымы толькі тады, калі ўнутры краіны для гэтага ёсць рэсурс. Хаця б ідэйны рэсурс. Ідэю Зянона Пазьняка большасць выбаршчыкаў не падтрымае. Каб байкот сапраўды адбыўся, павінна быць упэўненасць, што хаця б 70% беларусаў не пайшлі на выбары. У цяперашніх умовах гэта проста немагчыма хаця б з-за таго, што падчас будучых выбараў, як звычайна, будзе ўключаны адміністрацыйны рэсурс. Людзей будуць прымушаць ісці галасаваць.

Наша партыя толькі аднойчы падтрымала ідэю байкоту. Было гэта на пазамінулых выбарах у мясцовыя Саветы... Але зараз у выбарах удзельнічаць трэба, бо на вайне як на вайне... Трэба змагацца...

Павел СЕВЯРЫНЕЦ, сустаршыня незарэгістраванай партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя":

— Байкот магчымы толькі тады, калі большасць тых, хто змагаецца супраць рэжыму Лукашэнкі, заклікаюць да байкоту. На сённяшні дзень, наколькі я ведаю, апазіцыйныя сілы, якія супрацьстаяць уладзе, будуць прымаць удзел у выбарах. Дарэчы, на ўстаноўчым з'ездзе "Беларускай хрысціянскай дэмакратыі" было вырашана браць удзел у выбарах. Таму з ідэяй Зянона Пазьняка пагадзіцца нельга.

Юрась ГУБАРЭВІЧ, намеснік старшыні руху "За свабоду":

— На сённяшні дзень няма падстаў для байкоту выбараў. Таму рух "За свабоду" рыхтуецца ў іх удзельнічаць. Праўда, да выбараў застаецца яшчэ год. За гэты час можа нешта змяніцца. Але, яшчэ раз паўтаруся, на сённяшні дзень мы рыхтуемся браць удзел у гэтай кампаніі.

Мікалай СТАТКЕВІЧ, адзін з лідэраў кампаніі "Еўрапейская Беларусь":

— Не згодны. Я прыхільнік альтэрнатыўнай думкі. А альтэрнатыва гучыць так: "Няхай у няроўных умовах, але за ўладу трэба змагацца". Прычым у літаральным сэнсе гэтага слова. Менавіта змагацца, а не імітаваць барацьбу, як, напрыклад, гэта было ў 2006 годзе. Трэба ісці на выбары, а потым здолець адстаяць уласны выбар.

Валерый УХНАЛЁЎ, намеснік старшыні Партыі камуністаў Беларускай:

— Гэтую прапанову падтрымліваць нельга. З той прычыны, што ўдзел у выбарчай кампаніі на сённяшні дзень застаецца легальнай магчымасцю для сустрэч з людзьмі для тых палітычных сіл, якія не падтрымліваюць курс, што праводзіць дзеючая ўлада. Не выкарыстоўваць такі шанц — гэта глупства. Праўда, яго трэба выкарыстоўваць, разумеючы, што выбараў, па сутнасці, у Беларусі няма...

Аляксей ЯНУКЕВІЧ, старшыня Партыі БНФ:

— Пакуль пагадзіцца з такой прапановай нельга. Вызначальным момантам павінны стаць выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Калі і сапраўды будуць бачныя пэўныя крокі да дэмакратызацыі выбарчага працэсу, як, напрыклад, наяўнасць у выбарчых камісіях прадстаўнікоў апазіцыі, магчымасць адкрытага падліку галасоў — гэта адно. А вось калі мясцовыя выбары пройдуць па сцэнарыі, напісаным уладамі, то тады можа быць прынята рашэнне і наконт выбараў прэзідэнцкіх. Калі не будзе відавочнай дэмакратызацыі, то можна будзе разглядаць пытанне аб байкоце прэзідэнцкай кампаніі...

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ДЗІКУНСТВА!

Расправа за іншадумства?

Напрыканцы мінулага тыдня настаўніца гісторыі сярэдняй школы з вёскі Талька Пухавіцкага раёна **Наталля Ільініч** у суправаджэнні начальніка раённага аддзела адукацыі была выклікана на размову да кіраўніка Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі **Таісы Данілевіч**.

Таіса Данілевіч, галоўная начальніца настаўнікаў Мінскай вобласці.

— Прэтэнзій да маёй працоўнай дзейнасці ў кабінеце Данілевіч я не пачула, — расказвае Наталля Ільініч. — Але што там адбывалася! Я такога ў сваім жыцці не бачыла: каб так крычалі на людзей! Нават не магу падабраць слоў, каб гэта перадаць.

У кабінеце начальніка ўпраўлення знаходзіліся таксама яе тры намеснікі і сакратар. Усё адбывалася ў такой абразлівай форме, што не верылася, што я знаходжуся ў дзяржаўнай установе. Напрыклад, я размаўляла па-беларуску, а спадарыня Данілевіч па-руску, і ўвесь час перакрыўляла мае словы. Мне адкрыта было прапанавана напісаць заяву аб выхадзе з Партыі БНФ, папікнулі тым, што мы ладзім талькаўскі фестываль — свята фальклору, паэзіі і бардаўскай песні. Але ўжо два гады нам не дазваляюць яго праводзіць.

Данілевіч загадным тонам сказала мне напісаць заяву аб выхадзе з палітычнай партыі ці ў адваротным выпадку пакласці заяву аб звальненні са школы па ўласным жаданні. Пры гэтым я павінна была зрабіць свой выбар да 18 студзеня гэтага года. Таксама Данілевіч абавязала начальніка Пухавіцкага РАА Шастакову прывезці ёй копію пратакола партыйнага сходу аб выключэнні мяне з партыі не пазней за 20 студзеня гэтага года.

— Вы — даўні сябра партыі? Чаму менавіта зараз узнікла такая сітуацыя?

— Падзеі разгортваліся наступным чынам. У кастрычніку ў нашай вёсцы аб'явілі, што будуць аб'ядноўваць Талькаўскі сельскі савет з Блужскім. Адбыўся сход, на якім прысутнічалі прадстаўнікі Пухавіцкага райвыканкама. Амаль аднагалосна жыхары Талькі прагаласавалі супраць гэтага аб'яднання і напісалі зварот у абласны і раённы савет. Сярод падпісантаў была і я. Тэкст звароту мы паставілі на сайт. І амаль праз некалькі дзён з раённага аддзела адукацыі прагучала прапанова звольніць мяне з працы. Акрамя таго, кіраўнік аддзела турызму напрамілы бог прасіў звольніцца і з пасады кіраўніка краязнаўчага гуртка, казаў, што інакш яму не дадуць працаваць. З гуртка я сышла, а ў школе сітуацыя атрымалася цікавая. 28 студзеня заканчваецца мой працоўны кантракт. 12 студзеня дырэктар школы яго працягнула яшчэ на год, нягледзячы на тое, што ўжо прагучала "прапанова" мяне звольніць. А 15-га адбылася гэтая ганебная гутарка з Данілевіч і зараз я не ведаю, што будзе далей.

— З партыі выходзіць вы не збіраецеся і заяву аб звальненні пісаць не будзеце?

— Пакуль я толькі напісала заяву на імя пракурора Мінскай вобласці з просьбай правесці пракурорскую праверку таго, што адбылося, і прыняць меры пракурорскага рэагавання, скіраваныя на абарону маіх законных правоў.

Са школы сыходзіць не збіраюся. Па-першае, я вельмі люблю сваю працу. Таму пацвярджэнне — граматы, дыпломы, падзякі, якія я атрымлівала, у тым ліку і з боку абласнога ўпраўлення адукацыі. У маі гэтага года ў падначаленым спадарыні Данілевіч часопісе "Адукацыя Міншчыны" выйшаў мой артыкул пра сістэму краязнаўства ў школе, некалькі разоў мяне запрашалі ў Абласны інстытут развіцця адукацыі правесці для калег семінар па гэтай жа тэме, мае вучні не аднойчы перамагалі на рэспубліканскіх і абласных краязнаўчых конкурсах. У 2004 годзе выйшла мая кніжка "Талька і наваколле", я са сваімі вучнямі даследавала фактычна ўсе бакі жыцця мясцовых жыхароў. За ўсе 25 гадоў працы ў Талькаўскай сярэдняй школе я не мела ніякіх дысцыплінарных спагнанняў.

Па-другое, я адна выхоўваю дачку-студэнтку. І вы можаце зразумець, што для мяне азначае застацца беспрацоўнай.

Сітуацыя атрымалася непрыгожая, вельмі складаная для мяне ў маральным плане. Я разумею, што калі не сыду, будуць ціснуць на дырэктара, а яна пенсіённага ўзросту і звольніць яе вельмі проста, будуць дзяўбці школу рознымі праверкамі... Я — не герой, а звычайны чалавек, хачу застацца на працы, але і годнасць сваю таксама хачу захаваць. Для мяне гэта даражэй. І усё ж хачу верыць, што розум, здаровы сэнс пераможуць...

ЗВАНОК У МІНАБЛВЫКАНКАМ

«Такія каментарыі я даваць не магу»

Сапраўды, сітуацыя, пра якую распавяла Наталля Ільініч, з катэгорыі тых, пра якія кажуць: "Такога не можа быць". Няўжо ў нас час сапраўды можна звольніць з працы чалавека, прафесіяналізм якога не выклікае сумнення, толькі за тое, што ён з'яўляецца сябрам Партыі БНФ? Партыі, якая афіцыйна зарэгістравана на тэрыторыі Беларусі, адкрыта праводзіць сваю дзейнасць, ладзіць з'езды? Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі альбо грамадскае аб'яднанне "Белая Русь" таксама дэ-юрэ не дзяржаўныя структуры, але ж не звальняюць настаўнікаў з-за членства ў гэтых структурах, наадварот, уступленне ў гэтыя арганізацыі толькі вітаецца.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ПРОГНОЗЫ ЭКСПЕРТОВ

Вас волнует денежный вопрос?

После девальвации белорусского рубля в январе прошлого года большая часть населения с опаской ожидала прихода и нового, 2010 года. Основные опасения и тогда, и сейчас были по поводу резких изменений курсов валют и других факторов, которые могут уменьшить сбережения.

О ситуации на валютном рынке и прогнозах изменения цен на основные валюты в наступившем году рассуждают известные специалисты.

Вадим ИОСУБ, аналитик компании «ФорексЛАЙН»: *«Рано судить о том, как закончится 2010 год»*

— Перед тем как говорить о перспективах белорусского рубля, необходимо сделать краткий обзор ситуации на валютном рынке Беларуси за последнее время.

Львиная доля источников поступления валюты в страну в последние годы приходилась на экспорт продуктов нефтепереработки в Западную Европу, продукции машиностроения — в Россию, и минеральных удобрений — в страны BIC (Бразилия, Индия, Китай). С 2005 г. по первую половину 2008 г. для экономики Беларуси складывалась благоприятная внешняя конъюнктура. Рост стоимости нефти привел, с одной стороны, к опережающему росту стоимости нефтепродуктов на рынках Европы, а с другой — к росту спроса на продукцию белорусского машиностроения в России, которая буквально купалась в нефтедолларах (и готовилась превратиться в Мировой финансовый центр).

При этом закупки сырой нефти в России осуществлялись с льготированием экспортных пошлин, цена на газ постепенно росла, но при этом оставалась минимальной по сравнению с другими странами — потребителями российского газа. Рост мировых цен на сельхозпродукцию привел к росту цен на минеральные удобрения.

С середины 2008 года ситуация кардинально изменилась. Поступление валюты в страну резко сократилось, и в итоге — к концу 2008 г. золотовалютные резервы Беларуси стали быстро таять. Появились девальвационные ожидания. Вкладчики досрочно снимали средства с рублевых депозитов и переводили их в валюту. Имели место и полуофициальные ограничения на покупку валюты на бирже.

Ситуация на валютном рынке была близка к катастрофичной, и в этой ситуации руку помощи протянул МВФ, к которому еще в октябре 2008 года обратилась Беларусь за выделением кредита "с целью создания подушки безопасности".

Новый 2009 год страна встретила по согласованной с МВФ программой, которая предусматривала разовую девальвацию и переход от таргетирования курса доллара — к привязке к трехвалютной корзине. МВФ открыл рассчитанную на 15 месяцев программу помощи в размере 2,5 млрд дол., которая летом была расширена до 3,5 млрд долларов.

Беларусь в рамках совместной программы взяла на себя обязательства по реформированию экономики, часть из которых (упрощение регистрации предприятий, частичная либерализация ценообразования и др.) была успешно завершена, но структурные реформы (создание агентства по приватизации, создание инвестиционного агентства и передача ему от коммерческих банков функции финансирования госпрограмм) — выполнены не были.

Летом прошлого года МВФ заявил о готовности начать следующую программу помощи в размере 6—7 млрд дол. на очень выгодных условиях с точки зрения процентной ставки и сроков погашения, но власти страны от нее фактически отказались, чтобы не проводить структурные реформы в условиях, когда, по их мнению, экономический кризис закончился.

В результате в 2010 год страна вступает с золотовалютными резервами в размере около 5,6 млрд дол. и ожидаемым дефицитом торгового сальдо приблизительно того же порядка. Запланированные источники покрытия этого дефицита — размещение государственных облигаций на рынках России, Европы, привлечение прямых иностранных инвестиций, иностранные кредиты банкам и предприятиям.

Насколько эти планы по привлечению валюты в страну будут реализованы, не сейчас судить. В любом случае эти кредиты и размещения будут менее выгодны по срокам и ставкам, чем средства МВФ.

Резкая разовая девальвация маловероятна

— Накопленных резервов страны, вероятнее всего, хватит, чтобы удержать стоимость валютной корзины до конца года в 10%-ном коридоре (реально надо говорить именно о росте стоимости корзины на 10%). Резкая разовая девальвация маловероятна.

Наиболее вероятное колебание валютной пары EUR/USD на мировом валютном рынке в течение этого года — в пределах 1,3—1,6 доллара за евро (я лично склоняюсь к нижней границе этого диапазона). Возможная стоимость доллара к концу года может оказаться в достаточно широких границах 3,000—3,500 белорусских рублей за доллар. Причем верхняя граница этого коридора выглядит гораздо более реалистичной.

(Окончание на 2-й стр.)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Аляксей ЯНУКЕВІЧ: *«Паралелі паміж украінскімі выбарамі і беларускімі нават немагчыма правесці»*

Як вядома, Цэнтральная выбарчая камісія Украіны прызнала, што прэзідэнцкія выбары адбыліся. Адзін з беларускіх назіральнікаў, якому карэспандэнт "Народнай Волі" патэлефанаваў у Кіеў, лідэр Партыі БНФ Аляксей ЯНУКЕВІЧ падзяліўся сваімі ўражаннямі ад выбараў.

На момант падпісання газеты ў друк было вядома, што падлічана 86,82 працэнта галасоў. Лідзіраваў старшыня Партыі рэгіёнаў Віктар Януковіч (35,52 працэнта галасоў), за ім — Юлія Цімашэнка (24,89 працэнта). Трэці — былы кіраўнік Нацыянальнага банка Сяргей Цігіпка (13,04 працэнта). Дзеючы прэзідэнт Віктар Юшчанка толькі на пятай пазіцыі (5,41 працэнта). Паколькі ніводны з кандыдатаў не набраў у першым туры больш за 50 працэнтаў галасоў, для выяўлення пераможцы спатрэбіцца другі тур, які прызначаны на 7 лютага.

— Самае яркае ўражанне для мяне, што выбары на самай справе адбываюцца дэмакратычна, — распавядае Аляксей Януквіч. — Усе кандыдаты мелі магчымасць кантраляваць працэс арганізацыі выбараў ад пачатку і да канца. Прысутнічаць на ўчастках, бачыць бюлетэні і іх падлік... Гэта, на мой погляд, асноўнае дасягненне апошніх гадоў кіравання прэзідэнта Віктара Юшчанкі. І гэта, бадай, галоўнае дасягненне "аранжавай рэвалюцыі", Украіна стала дэмакратычнай краінай.

Падчас выбараў былі поўная празрыстасць, поўны кантроль і поўны доступ да інфармацыі.

— Які працэнт выбаршчыкаў прагаласаваў датэрмінова?

— Не магу назваць зараз дакладную лічбу, але зноў-такі — усе кандыдаты маглі ў роўнай меры кантраляваць і працэс датэрміновага галасавання. Былі, натуральна, і заўвагі, аднак яны істотна не паўплывалі на вынікі выбараў.

— Калі правесці паралелі ўкраінскіх выбараў з беларускімі...

— А іх немагчыма праводзіць, паколькі ва Украіне на самай справе праводзяцца выбары, а ў Беларусі, на жаль, усе гэтыя кампаніі нагадваюць адміністрацыйны механізм перапрызначэння, які суправаджаецца рэпрэсіямі супраць апанентаў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная воля
http://www.nv-online.info
19—21 СТУДЗЕНЯ 2010 г.

РЕЗОНАНС

От автора

Отвечу сразу тем, кто, чувствую, спросит, почему я написал по-русски. Хочу, чтобы обязательно прочитали и все те, кто в сегодняшних условиях "не дружит" с белорусским языком.

Александр Григорьевич, и я скажу откровенно...

Перед Новым годом Александр Лукашенко решил устроить пресс-конференцию и ответить на вопросы, волнующие белорусское общество. Затронуты были самые разные темы: экономика, политика, международные отношения, таможенный союз, проблемы белорусского языка и даже личная жизнь главы государства. Некоторые ответы, не скажу, что сильно (слышали и не такое), но лично меня обескуражили.

Вот А.Липай, руководитель информационного агентства "БелаПАН", задает вопрос: *"Беларуская мова зараз знаходзіцца ў заняпадзе*, у тым ліку з-за дэфіцыту падтрымкі з боку беларускай дзяржавы. Я прапаную ўвесці сістэму дзяржаўных грантаў і прэферэнцый для грамадскіх арганізацый, якія займаюцца моўнымі праблемамі, для беларускамоўных сродкаў масавай інфармацыі і для беларускамоўных класаў і школ". Разумная, спокойная, не дерзкая и не каверзная постановка вопроса. На самом деле, поддерживаем же мы хоккейных пенсионеров всего мира, создаем условия для их тренировок и игр, белорусский президент учредил даже специальные призы; хорошо подкармливаем БРСМ, на всякие базары, ярмарки и фэсты не скупимся...

Не знаю, какой ответ хотел получить А.Липай, но, думаю, не такой: *"...Мы договорились быть откровенными, и я вам скажу откровенно: вопросы языковые раз и навсегда в стране решены. По крайней мере, в тот период времени, пока я буду президентом.*

Мы этот вопрос однозначно решили на референдуме, и я не собираюсь вносить какие-то дополнения и новшества". Тут бы и остановиться, ответ на вопрос дан четкий: все решено, никакой поддержки и помощи белорусскому языку не будет! Но, видимо, Александру Григорьевичу захотелось маленько уточнить свою позицию и развить ее дальше. И тут начинается самое любопытное. *"Но,* — продолжил глава государства, — *если тебе помогают и ставят условия, тогда будь добр исполнять, во всем мире так принято. Так и по языку"*. Оказывается, белорусскому народу с белорусским языком уже помогли, а народ в благодарность за это должен выполнить какие-то поставленные властью условия. Вы логику уловили? Видимо, нам власть усердно помогает окончательно добить государственный (только по Конституции, а не де-факто) язык, а мы ей за это еще и что-то должны.

И на свет появляется самый важный козырь. *"И скажу главное, это мое личное убеждение,* — подчеркнул А.Лукашенко, — *только идиот в Беларуси может отказаться от русского языка. Посмотрите вокруг себя: кроме разговорной речи, в науке особенно. Вы что, хотите ее загубить вообще? В здравоохранении — там же термины. Их пока на белорусской мове не придумали. А те, что придуманы, стыдно даже иногда говорить, повторять"*.

Президенту в вопросе журналиста очень не понравилась оценка, что *"беларуская мова знаходзіцца ў заняпадзе"*, и он попытался доказать обратное, чуть ли не процветание ее в процветающей Беларуси. Но прочтите еще раз вышеприведенный абзац, и вы убедитесь, что А.Лукашенко не опроверг А.Липая, а лишь подтвердил "заняпад беларускай мовы". Видите ли, она якобы годится только для кухни, не развита, используя ее, мы угробим науку, здравоохранение. И дальше: наш язык оперирует такими терминами, что их стыдно произносить. Короче, не язык, а стыдобище.

Одним словом, не просто "заняпад", а полный "заняпад" белорусского языка. И это не может не вызывать тревогу не только у А.Липая. Я думаю точно так, как и он.

А теперь представим себе следующую картину. Президент Франции, выступая по всем телеканалам, заявил своему народу: "Знаете, я пришел к выводу, что наш язык годится только для объяснения с дамами, а для науки, медицины, нанотехнологий он не подходит. Этим задачам лучше всего соответствует английский. Ведь почти все термины на нем". Каким бы словом назвали своего президента французы? Правильно думаете. Да и после этого вряд ли удержался бы он на высоком посту.

Да что там Франция. Великая держава все-таки! Возьмем нашу соседку — маленькую Латвию. Какими словами встретили бы латыши гражданку Канады Вике-Фрейберга, претендовавшую на пост президента, заявившую им нечто подобное? Мол, дорогие земляки, мы тут сидели столетиями на крохотном пятачке, а сейчас вот позвали нас в большую Европу. Как мы общаться с ней будем? Нас же никто не поймет. И наука вот гибеет. Язык терять, конечно, жалко, но мы его на пластинки запишем, вечерами слушать будем. Как бы народ отреагировал? Правильно думаете. Назавтра Вике-Фрейберга последовала бы по маршруту чемодан—вокзал—Канада. Но поскольку она с такой речью не обратилась к соотечественникам, а наоборот, все ее выступления были на родном, латышском, языке, что импонировало людям, то именно она и стала президентом Латвии.

А вообще-то мы можем назвать хоть одно государство, президент которого стыдился бы языка народа, которым он руководит? Я нет. Мне очень хочется, чтобы со стороны А.Лукашенко это была случайность. В пылу полемики кого не заносит, ложный посыл влечет и ложный вывод. Но когда на многомиллионную аудиторию заявляется: *"И скажу главное, это мое личное убеждение: только идиот в Беларуси может отказаться от русского языка"*, — хочется спросить: а как назвать тогда человека, отказавшегося от белорусского, родного языка? Неужели умницей? По Конституции русский и белорусский языки равны, равнодоступны и не могут подвергаться дискриминации по отношению друг к другу. Значит, и второй человек — идиот. Получается, у нас страна идиотов...

С другой стороны, ваше, Александр Григорьевич, утверждение в корне неверно, даже абсурдно. Никто в нашей стране не думал и не думает отказываться от русского языка. Это все политические страшилки, рассчитанные на простаков. Ни один президент, прими он хоть сто указов и законов, не сможет заставить человека отказаться от русского языка. По той простой причине, что других языков он не знает (ни английского, ни французского, ни немецкого, к сожалению, не владеет или очень плохо владеет и белорусским). И таких в стране немало. Не сможет сделать этого и оппозиция, окажись она у власти. Да и не будет она бесполезным делом заниматься, не такая уж она глупая, как некоторым хотелось бы ее представить. Лишь считанные проценты жителей знают 2—3 языка. Но и они не дураки, это же их капитал. Потому даже под страхом смертной казни они не откажутся от русского слова. Сегодня человек здесь, а завтра поехал в Россию, где русский язык ой как пригодится. А если белорус, кроме родного и русского, знает еще, например, английский или немецкий, так это великое счастье и прекрасные перспективы. Какой чудак откажется от счастья?

Вернемся, однако, к стыду и научным терминам. Странный мы, белорусы, народ. Стыдимся своего, родного, нами рожденного, нами выстраданного. Это же, пожалуй, самое путное, что мы сделали за многовековую историю. Этим гордиться надо, а мы стыдимся вслух об этом говорить. Наоборот, слышим: она, наша мова, и неблагозвучная, и ассоциации нехорошие вызывает... Почиться бы у других наций, где неблагозвучие (с нашей колокольни) не мешает им чувствовать себя достойными людьми. Например, имя коллеги белорусского президента — китайского руководителя Ху Дзинь Тао мы и россияне немножко сократили, но он не кинулся менять свою фамилию, чтобы благозвучнее нам слышалось. Плевал он на это с Великой китайской стены. Есть футболист по фамилии Кака. Так что теперь, лучшему футболисту мира стыдиться этого? В японском языке отсутствует звук, обозначаемый буквой "ш", а в польском этих "ш" с огромным избытком. Так что, может, посоветуем для благозвучия перейти им на итальянский? Кстати, итальянский язык экспертами ООН признан самым благозвучным в мире. А на втором месте — гордитесь! — наш белорусский. Это совсем не свидетельствует о том, что другие языки хуже. Нет, каждый из них уникален, он единственный и неповторимый. Чего же тут стыдиться? Стыдиться надо другого...

Во время ответа А.Лукашенко, обращаясь к журналисту, требовал: вы, мол, докажите, что "мова ў заняпадзе". Но журналисту больше слова не дали. А доказывается все элементарно. Нашей обыденной жизнью. Вот, скажем, судят белоруса в Беларуси. Белорусский судья, белорус по национальности, обращается к подсудимому-белорусу через переводчика, потому что не владеет белорусским языком. Заметьте, государственным. Ситуация немыслимая ни в одной другой стране мира.

Еще один пример. Иностранный посол во время встречи с государственными чиновниками обращается к ним на нашем национальном белорусском государственном языке, а они ему на своем родном белорусском языке ответить не могут. Потому что не знают. Вот где стыдоба-то! Где-нибудь в мире еще можно встретить такое? У нас же подобных примеров, к сожалению, можно привести сотни.

Чиновники говорят: родители не отдают детей в белорусскоязычные классы. А заинтересовало их государство в этом? У нас много институтов, университетов, академий с преподаванием на белорусском языке? Совсем нет.

Вообще, некоторые пассажи президента, кроме улыбки, ничего вызвать не могут. *"Я очень рад,* — сказал А.Лукашенко, — *что мой малыш, когда мы едем в автомобиле, включает музыку и слушает песни, в основном Науменко, "Сяброў", якія спяваюць на беларускай мове. Домой приходит, начинает мне пересказывать это. Его никто белорусскому языку еще не учил. Говорит: "А я, папа, на беларускай мове буду спяваць". Вот и все. И я ему не запрещаю, но рекомендую, он должен знать белорусский язык. Поэтому давайте оставим эту очень щепетильную, очень острую тему..."*

Вам, уважаемые читатели, ничего здесь не кажется странным, даже анекдотичным? Слов нет, сын у президента действительно хороший, умный, даже, видимо, талантливый мальчик. Вот прослушал пару раз "Сяброў" и сразу заговорил на мове: "Папа, я буду спяваць..." А ведь его никто еще белорусскому языку не учил. Мой внук-подшиванец на годик-два старше тоже любит включать песни. Правда, на английском. Но ни разу еще не сказал мне что-нибудь толковое или даже бестолковое на этом языке. Наверное, потому, что детей все-таки принято учить. Ходить, держать ложку, садиться на горшок, произносить первые слова, узнавать буквы, потом читать, не бить сестренку букварем по голове... Да всему надо ребенка учить. В том числе и белорусскому языку, чтобы потом не ходили в библиотеку искать стихи Быкова. Даже немки, жены русских царей, считали своим святым долгом выучить самим и научить своих детей языку народа, которым они управляли. Вы можете себе представить, чтобы президент, скажем, Армении не учил своих детей армянскому, а президенты Эстонии, Литвы, Польши, наконец Чечни, Татарстана языкам своих народов?

Поэтому стоит ли гордиться Александру Григорьевичу тем, что его сына, который вот-вот пойдет в школу, еще никто не учил белорусскому языку?

И последнее. Утверждение президента, что русский богаче белорусского в высоких сферах, по меньшей мере спорно. Заметьте, во фразе, которую А.Лукашенко очень любит повторять — "Президент — гарант Конституции", нет ни одного исконно русского слова.

Я, Александр Григорьевич, как и вы, человек отчроженный. И скажу также откровенно: к сожалению, языковые вопросы в Беларуси не решены. И с вами или без вас, но нам, белорусам, их придется решать.

Михаил МИХАЕВИЧ,
гражданин
Республики Беларусь.

СЭРЦАМ ПАЭТА

У гэтай краіне не маю я дома
Вось воблака, сяду і ў свет палячу
Над гэтай гаморай, над гэтым садомам.
Ні гроша, ні славы — я волі хачу.

Анатоль СЫС.

ЧУЛІ?

На базе МТЗ-80 «Беларус» створаны самы хуткі трактар у свеце

Расійская кампанія "Бізон" заявіла пра стварэнне самага хуткага трактара ў свеце, які будзе прымаць удзел у гонках па гэтым відзе транспарту.

Супертрактар створаны на базе 25-гадовага МТЗ-80 "Беларус".

Першы варыянт гэтага трактара быў паказаны яшчэ ў мінулым годзе — тады машына здолела разагнацца да 85 км/г. Але затым "балід" сур'ёзна мадэрнізавалі. Галоўным вынікам мадэрнізацыі стала здольнасць сельгасмашыны пераадолець мяжу ў 100 км/г (парог пакуль не вызначаны) і поўная гатоўнасць усталяваць сусветны рэкорд трактарнай хуткасці.

Наркалагічныя аддзяленні Мінска перапоўнены пасля навагодніх святаў

Наркалагічныя аддзяленні ў Мінску перапоўнены, у некаторыя нават ёсць чарга. Як паведаміў "Інтэрфаксу" галоўны нарколаг сталіцы Сяргей Малочка, гэта традыцыйная карціна сярэдзіны студзеня. "У наркалагічных аддзяленнях падчас навагодніх святаў з канца снежня да сярэдзіны студзеня зацішша, а пасля старога Новага года павялічваецца лік пацыентаў", — адзначыў лекар.

Па яго словах, ужо ёсць чарга на шпіталізацыю ў жаночае наркалагічнае аддзяленне, якое ў беларускай сталіцы адно. Малочка распавёў, што, як правіла, на лячэнне ў наркалагічныя аддзяленні людзі прыходзяць самі. Як правіла, гэта жанчыны ва ўзросце каля 40 гадоў і мужчыны ва ўзросце ад 30 да 60 гадоў.

У цяперашні час на наркалагічным ўліку ў Мінску стаіць 49.549 чалавек, з якіх 9122 — гэта жанчыны, больш за 5 тысяч — падлеткі.

ПЫТАННЕ—АДКАЗ

Якія намалоты збожжа ў Расіі?

На мінулым тыдні глядзеў па адным з расійскіх тэлеканалаў рэпартаж аб наведванні Ленінградскай вобласці У.Пуціным. Ён сказаў, што праз пяць-шэсць гадоў Расія поўнасцю вырашыць праблему забеспячэння сельскагаспадарчай прадукцыяй. Цікава, а якая сітуацыя ў іх сёння, напрыклад, з намалотамі збожжа?

Карней СІДОРСКІ, жыхар Магілёва.

Нядаўна Федэральная служба дзяржаўнай статыстыкі Расіі абнародавала вынікі працы хлебаробаў за 2009 год. Яны, заўважым, не зусім радасныя. У параўнанні з папярэднім годам зерневых і зернебабовых сабралі (у вазе пасля дапрацоўкі) на 10,3 працэнта менш. У 2009 годзе — 97,036 мільёна тон, а ў 2008-м — 106,739 мільёна.

Знізіліся валавыя зборы і сланечніка — з 7,35 мільёна тон да 6,42 мільёна тон.

Пакуль Расія не можа спаборнічаць з развітымі краінамі па ўраджайнасці каласавых культур. У сярэднім з гектара намалочана 22,7 цэнтнера зерневых і зернебабовых. Так, ураджайнасць пшаніцы на круг — 23,2 цэнтнера, жыта — 20,7, ячменю — 23,1.

Каб вырашыць праблему самазабеспячэння хлебам, Расія ў бліжэйшыя пяць-шэсць гадоў павінна рэзка павысіць ураджайнасць літаральна ўсіх каласавых культур. Калі тое, аб чым гаварыў прэм'ер Уладзімір Пуцін, спраўдзіцца, гэта можна будзе лічыць цудам.

СКАНДАЛ

Памочнік міністра энергетыкі трапіў за краты

Памочнік міністра энергетыкі стаў фігурантам гучнай крымінальнай справы і сустрэў Стары Новы год у ізалятары часовага ўтрымання.

Генеральная пракуратура пачала крымінальную справу за махлярства на памочніка міністра энергетыкі Андрэя Жукава, які таксама ўзначальваў упраўленне кантролю і справаводства ў гэтым ведамстве.

Жукава падазраюць у тым, што ён, а таксама генеральны дырэктар ЗАТ ІПП "Еўразнерга" Ігар Паўліш і кіраўнік адной з літоўскіх фірм 30 мая 2008 года падпісалі дамову паміж РУП "Магілёўэнерга" і пасярэдніцкай структурай ЗАТ "Еўразнергетыка" на паставку электраномпы для патрэб ЦЭЦ-2 Магілёва па неабгрунтаванай завышаным кошце. У выніку быў здзейснены крадзеж грашовых сродкаў РУП "Магілёўэнерга" на суму 1 млрд 546 млн 706 тыс. 088 рублёў.

Ігара Паўліша пракуратура Мінска затрымала яшчэ 30 студзеня 2009 года. На думку следства, у снежні 2006 года ён, паставіўляючы абсталяванне для РУП "Мінскэнерга", прычыніў дзяржаўнаму прадпрыемству шкоду ў памеры 2,5 млрд рублёў.

ПРОГНОЗЫ ЭКСПЕРТОВ

Вас волнует денежный вопрос?

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

О выборе состава корзины валют для личных сбережений

— Перед каждым, кто имеет сбережения, стоит выбор — в какой валюте их хранить. Безусловно, это должна быть не одна валюта, а корзина валют. А состав этой корзины зависит от субъективного взгляда на перспективы белорусского рубля.

При оптимистичном взгляде (в надежде, что по итогам года белорусский рубль останется в рамках 10%-го коридора) имеет смысл составить корзину из трех валют: одна треть — белорусский рубль, одна треть — евро, одна треть — доллар. При более осторожном подходе можно ограничиться двумя валютами: половина — евро и половина — доллар.

Хранить деньги в российских рублях я бы не рекомендовал — слишком велика неопределенность и слишком высока зависимость стоимости российского рубля от мировых цен на нефть... Хранить деньги в российских рублях можно советовать лишь тем, кто любит адреналин.

Николай ИВЧЕНКО, руководитель информационно-аналитического центра FOREX CLUB в Украине:

«Доллар начнет расти с апреля-мая»

— Стоимость валютной пары EUR/USD в 2010 году во многом будет зависеть от мер денежно-кредитного, фискального стимулирования в основных странах. Полагаю, что с начала года до апреля-мая евро имеет все шансы вырасти по отношению к американскому доллару до уровня 1,4700—1,4800.

Это объясняется тем, что в начале 2010 года основные страны будут продолжать стимулировать свои экономики, вливая ликвидность. Далее ожидается, что страны — экономические лидеры начнут сворачивать меры денежно-кредитного стимулирования с середины 2010 года.

Таким образом, можно сделать вывод: начиная с апреля-мая 2010 года доллар США в мире начнет расти, и соотношение EUR/USD к концу 2010 года снизится до уровня 1,3800.

Кстати, в прошлом году достаточно выгодным вложением средств было золото, цены на которое в мире за год поднялись на 23,7% — с уровня 885 дол. за тройскую унцию до 1095 долларов. Данный рост произошел вследствие падения стоимости доллара по отношению к основным валютам.

От этого же фактора будет сильно зависеть цена золота на мировом рынке и в течение 2010 года. По нашим оценкам, максимальный уровень, которого золото может достигнуть в следующем году, — это уровень 1300 дол. за тройскую унцию, что означает рост цен от текущего уровня на 16%.

Олег ГУД, региональный директор инвестиционной компании "БГ Капитал" (BG Capital) в Беларуси:

«Белорусский рубль скорее всего удержится в 10-процентном коридоре колебаний к корзине инвалют»

— С наступлением января люди обеспокоенно следят за курсом белорусского рубля. Ходят слухи об очередной девальвации, и, на первый взгляд, для этого есть основания. Будем открыто говорить о существующих проблемах в стране, оказывающих влияние на стабильность национальной валюты, которые обострил мировой финансовый кризис.

Отсутствие новых технологий, низкоконкурентная продукция, рост складских запасов, сокращающийся вымыванием оборотных средств, и как следствие — увеличение дефицита внешнеторгового баланса (за 11 месяцев сложился в размере 6,4 млрд дол.), валюты и платежного баланса. Все эти факторы, безусловно, оказывают давление на белорусский рубль.

Это понимают все, и действия по решению данных проблем, такие как увеличение объемов производства, улучшение качества продукции (тем более 2010 год объявлен годом качества), диверсификация производства, поиск новых рынков сбыта и развитие инвестиционной привлекательности страны, возымеют свои положительные последствия.

Поставленные перед правительством и Национальным банком задачи по удержанию белорусского рубля в 10-процентном коридоре колебаний к корзине иностранных валют (евро, доллар США и российский рубль), что предусмотрено основными направлениями денежно-кредитной политики Беларуси на 2010 год, полагаю, будут выполнены.

И главное, не будем забывать о политической составляющей наступившего года. Этот год — год выборов депутатов в местные Советы, а также предвыборный год на пост Президента страны. Так что мы не ожидаем никаких серьезных скачков рубля. Вследствие этого на данный момент самыми выгодными будут являться депозиты в национальной валюте.

О новых инструментах фондового рынка как альтернативе вкладов

— Если же говорить о долгосрочном периоде, то диверсификация своих сбережений являлась, является и будет являться важной составляющей инвестиционной концепции, снижающей риски... но, к сожалению, часто и доход. Тут я посоветую начать присматриваться к инструментам фондового рынка, а именно к акциям.

Это инструмент для инвестиций при грамотном подходе может принести в долгосрочной перспективе (два-три года) очень хорошую прибыль, так как акции многих предприятий и даже отраслей на данный момент недооценены. С выходом мировой экономики на предкризисное состояние они покажут хороший рост.

О мировых валютах

— Что касается мировых валют, то год обещает быть интересным. Основной интригой года, по моему мнению, может стать падение доллара на 20—25% в ближайший год. Рост обязательств США подрывает доверие инвесторов к доллару и отрицательно влияет на репутацию главной мировой валюты, о чем говорит и статистика относительного снижения доли доллара в мировых запасах большинства мировых держав.

Российский рубль будет укрепляться в течение всего года вслед за медленным, но уверенным ростом цен на нефть. Что касается евро, то я думаю, что будет небольшой рост, сдержанный проблемами новых членов европейского альянса.

("Infobank".)

СПЕЦКАМАНДЗІРОЎКА

Доўгая дарога да дома

Бабруйчанка Аксана Цішкова — шматдзетная маці. Яна адна гадуе шасцярых цудоўных дзетак і ўжо шмат гадоў марыць атрымаць уласнае жыллё. Але ў сацыяльнаарыентаванай краіне, якой з экрана тэлевізара і старонак дзяржаўных газет падаецца Беларусь, атрымаць квадратныя метры, каб у нармальных умовах выгадаваць дзяцей, аказваецца не так проста...

У цеснаце, але не ў крыўдзе

Бярвенчаты дом у 1-м Далёкім завулку ў Бабруйску, у якім жыве сям'я Цішковых, нічым не адрозніваецца ад астатніх пабудоў, што стаяць тут жа. Звычайная прыватная хата.

Заходжу. Мяне сустракаюць Аксана разам з дзеткамі. Відавочна, што гасцям тут рады заўжды.

У доме — чатыры пакоі і кухня. Хата чыста прыбрана. Мяне запрашаюць у адзін з пакояў, дзе стаіць вялікі ложак. На ім звычайна спяць самыя маленькія дзеткі Аксаны — чатыры дзяўчынкі. Побач, на канапе, спіць і сама Аксана.

Самай старэйшай дачцэ Аксаны Цішковай — Людміле ў гэтым годзе споўніцца семнаццаць. Люда ходзіць у мастацкую вучэльню, кажуць, дзяўчына не без таленту. Пра гэта, акрамя работ Людмілы, сведчаць пісьмовыя ўдзячнасці ад кіраўніцтва ўстановы, якія не без гордасці за дачку паказвае мне Аксана.

А самай малодшай дачцэ — Алёнцы споўнілася толькі чатыры... Але і ў яе таксама творчая натура. Алёна з дзіцячай непасрэднасцю вырашыла парадаваць аўтара гэтых радкоў наваголнімі вершыкамі...

Дарэчы, апошнія роды ў Аксаны праходзілі вельмі цяжка... Перад урачамі стаяў выбар: ратаваць маці ці дзяўчынку... Дзякуй Богу, уратавалі абедзвюх. Таму, калі з'явілася Алёнка, Аксана была на сёмым небе ад шчасця. І не важна, што пасля родаў яна аказалася надоўга прыкаванай да ложка, бо пачаліся вялікія праблемы з пазваночнікам... Жанчына здолела справіцца з хваробай, бо ведала: трэба падымаць дзетак...

"Так атрымалася, што я гадую дзяцей адна, без мужа, мы разышліся з ім, — распачынае свой аповед жанчына. — *Раблю ўсё, каб мае дзеткі раслі ў любові і дастатку. Сама я па спецыяльнасці пекар, але зараз працую на мясакамбінаце. Як там плацяць? Атрымліваю 320 тысяч у месяц. Яшчэ даюць дапамогу на ўтрыманне дзетак. Напрыклад, летам, каб зарабіць лішнюю капейчыну, збіраю грыбы і ягады, якія і прадаю падчас свайго адпачынку... Ну і, канечне, нам дапамагае мая мама, у якой мы ўсе і жывём. На жыццё хапае, я не скарджуся..."*

Безумоўна, Аксана — самаахвярная маці. Пагадзіцеся, далёка не кожная жанчына пойдзе на тое, каб у наш час мець шмат дзетак.

Ды і бачна, што скардзіцца на жыццё яна не прывыкла. Проста няма калі...

"Жывём дружна, але цеснавата", — прызнаецца Аксана. І ў пацвярджэнне сваіх слоў праводзіць мяне на кухню, дзе і ўтрох сесці складана, не тое што накарміць усіх дзетак разам.

Таму абедае сям'я Цішковых у некалькі заходаў: спачатку малодшанькія, а потым — старэйшыя. Дарэчы, у дзень майго прыезду да Цішковых у сямейным меню была грэчка з каўбасой і яйкамі, а таксама шматлікія разнасолы — гуркі, памідоры, грыбы...

Пасля абеду малодшыя дзеткі ідуць маляваць ці глядзець мультфільмы, а старэйшыя робяць урокі... Раз-пораз гэта даводзіцца рабіць на шчыльна састаўленых табурэтках. Прыватны дом маці Аксаны Цішковай хоць і падаецца прасторным, але месца вялікай сям'і ў ім не хапае...

Пра паляпшэнне жыллёвых умоў Аксана Цішкова марыць даўно. Але пераехаць ва ўласнае жыллё яна разам з дзеткамі, хоць гэта і прадугледжана законам, не можа...

Дзеці для чыноўнікаў не доказ

Зараз Аксана з шасцю дзецьмі прапісана ў бабруйскай аднапакаёўцы разам з састарэлай бабуляй. Але, каб дзяцей хаця б было дзе спаць пакласці, жыве разам з маці, у яе хаце.

На чаргу з мэтай паляпшэння жыллёвых умоў Аксана Цішкова стала яшчэ ў 1993 годзе. Бабруйскі гарадскі выканаўчы камітэт пачаў падбор жылля для Цішковай у 2004-м. *"Гэта быў сапраўдны здзек,* — гаворыць жанчына. — *У асноўным прапаноўвалі жыллё ў нядобраўпарадкаваным жыллёвым фондзе ці інтэрнатах. Я выязджала па адрасах... Але што такое пакой у інтэрнаце? Маленькі бокс, у які акрамя шасці ложкаў нічога не ўмесціш".*

Карацей, ад прапанаваных бабруйскімі ўладамі варыянтаў Цішкова адмаўлялася і ў рэшце рэшт у красавіку 2005 года была ўключана ў склад жыллёва-будаўнічага кааператыва №130. *"Мая эпапея з атрыманнем жылля на гэтым не скончылася,* — працягвае Аксана. — *Але на той момант я афіцыйна не была прызнана шматдзетнай маці. Дзіўна, ці не так? У мяне на руках было шэсць дзяцей, але шматдзетнай маці я не лічылася. Бо не было адпаведнага пасведчання, без якога банк не мог адкрыць для мяне лінію на льготнае крэдытаванне. У снежні 2005 года мяне з-за невыканання абавязкаў па адкрыцці крэдытнай лініі проста выключылі са складу членаў жыллёва-будаўнічага кааператыва. А дом, які будаваў гэты ЖБК, быў здадзены пад ключ у тым жа снежні 2005 года. Вось так: дзеці — не галоўнае, галоўнае — "корачкі", для чыноўнікаў і банкіраў найважнейшае — паперчына...*

Дарэчы, пасведчанне аб тым, што я ўсё ж такі сапраўды з'яўляюся шматдзетнай маці, мне выдалі 18 студзеня 2006 года, праз месяц пасля здачы дома..."



Аксане было крыўдна да слёз...

Яна гадавала дзетак і проста не мела сіл і часу скандаліць з чыноўнікамі. Шмат чуючы пра тое, як дзяржава на самым высокім узроўні клапоціцца і пячэцца пра шматдзетных маці, але прайшоўшы праз не самае лепшае стаўленне да сябе з боку чыноўнікаў, Аксана ледзьве не апусціла рукі. Нават думала з'ехаць з Бабруйска. Але, пераступіўшы праз сябе, вырашыла ўсё ж такі звярнуцца да бабруйскіх улад, з тым каб яны хадайнічалі аб прысуджэнні ёй Ордэна маці... Усё ж такі адна падымае дзяцей, гадуе (і не самым горшым чынам гадуе) грамадзян гэтай краіны! Зразумела, спадзявалася, што атрыманне ўзнагароды неяк паскорыць атрыманне ўласнага жылля...

Тады, у 2006-м, Аксане адмовілі.

На паўторны зварот, на які жанчына адважылася ў 2008 годзе, з Першамайскага раёна Бабруйска прыйшоў вось такі адказ, падпісаны старшынёй мясцовай адміністрацыі спадаром Цепляковым: *"Ордэнам маці ўзнагароджваюцца жанчыны, якія выхоўваюць дзяцей, забяспечваюць іх фізічнае, маральнае, духоўнае здароўе і паўнавартаснае развіццё.*

Улічваючы вышэйзгаданае, вывучыўшы характарыстыкі Вашай сям'і ўстаноў аховы здароўя і адукацыі, адміністрацыяй Першамайскага раёна 15 сакавіка 2006 года прынята рашэнне ўстрымацца ад хадатайніцтва перад Магілёўскім аблвыканкамам аб прадстаўленні Вас да ўзнагароджання ордэнам Маці. У выніку праведзенага ў чэрвені 2008 года паўторнага абследавання ўмоў пражывання Вашай сям'і падстаў для перагляду ўказанага рашэння адміністрацыі раёна не ўстаноўлена".

За агульнымі фразамі чыноўніка, здаецца, крыецца непрыхаваная абраза Аксаны Цішковай. *"Заўважце, ніякіх канкрэтных фактаў з устаноў адукацыі і аховы здароўя не прыводзіцца!* — абураецца жанчына. — *Іх проста не можа быць. Што, мае дзеткі хварэюць больш чым усе? Ці вучацца горш за іншых? Не! А пасаж пра ўмовы пражывання ўвогуле не вытрымлівае ніякай крытыкі. У мяне ж проста няма жылля. Плакаць хочацца... Абразілі не мяне, а дзяцей..."*

Наваселле будзе ў лютым?

Нягледзячы на ўсе пакуты, праз якія прайшла Аксана, крэдытная лінія на пабудову жылля для шматдзетнай маці ўсё ж такі была адкрыта: 238 мільёнаў рублёў на 40 гадоў. На гэты раз жанчына ўступіла ў жыллёва-будаўнічы кааператыў №154. *"Дом павінен быў здавацца ў эксплуатацыю яшчэ ў снежні мінулага года. Па крайняй меры, так мне гаварылі, калі я ўступала ў кааператыў. Зараз тэрміны наваселля пераносяцца. Спасылаюцца то на крызіс, то на ўмовы надвор'я, маўляў, у траскучыя маразы нельга рабіць працы па аддзелцы дома. І канца работам пакуль не бачна",* — Аксана ўжо проста на мяжы адчаю.

Карэспандэнт "Народнай Волі" пабываў на месцы, дзе пабудаваны дом, у які павінна ўсяліцца сям'я Цішковых. Дом стаіць у маляўнічым месцы на вуліцы Навумава. У ім Аксане будуць належаць дзве кватэры — двух- і трохпакаёвая. Побач з домам — будаўнічая тэхніка і матэрыялы. На будоўлі — ні душы...

Тым не менш нам удалося датэлефанавацца да старшыні жыллёва-будаўнічага кааператыва №154 Кацярыны Крапінкінай. "*Так, першапачаткова здача дома па Навумава, 34 планавалася на снежань мінулага года*, — пацвердзіла яна. — *Аднак будаўнікі не паспелі ў тэрмін. Зусім нядаўна я, як старшыня ЖБК, атрымала ад іх дакументы, у якіх гаворыцца, што дом будзе здадзены ў лютым. Там засталося зрабіць толькі ўнутраныя аддзелачныя работы".*

З адказу вынікае, што наваселле ва ўласнай кватэры Аксана Цішкова справіць у наступным месяцы...

"Мне хацелася б верыць, што так яно і будзе, — гаворыць Аксана, — *каб нарэшце доўгая дарога да ўласнага дома нашай сям'ёй была пераадолена".*

Развітваючыся з Аксанай, міжволі ўспомніў гучную гісторыю пра тое, як па асабістым загадзе Аляксандра Лукашэнкі катэджы пад Мінскам, якія належалі ўплывовым міліцэйскім чынам, былі перададзены шматдзетным сем'ям. Ці няма вакол Бабруйска міліцэйскіх і чыноўніцкіх катэджаў, узведзеных у абход закона? Многія начальнікі ідуць на розныя парушэнні добра разумеючы, як важна для чалавека жыць у нармальных умовах. Думаецца, пры жаданні і пытанне з жыллём для бабруйчанкі Аксаны Цішковай і яе дзяцей павінна было вырашыцца даўно і станоўча...

Як будуць развівацца падзеі далей — аб гэтым мы абавязкова напішам пазней.

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота аўтара.

Мінск—Бабруйск.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

Не намі створана, але мы прададзім

Мае сваякі працуюць на БелАЗе і расказваюць, што па заводзе даўно ходзяць чуткі аб магчымым продажы гэтага прадпрыемства. Ці так гэта?

Наталля Гулейчык, г.Мінск.

Ніколі Беларусь не прапаноўвала патэнцыйным інвестарам адразу столькі буйных прадпрыемстваў. У іх ліку, дарэчы, БелАЗ. Гэтае буйнейшае прадпрыемства ўнесена ў прыватызацыйныя планы.

Могуць змяніць уласніка і многія іншыя заводы, напрыклад:

— Мінскі завод аўтаматычных ліній імя П.Машэрава;

— Аршанскі інструментальны завод;

— Гомельскі "Цэнтраліт";

— Мінскі станкабудаўнічы завод імя С.Кірава;

— Аршанскі станкабудаўнічы завод і іншыя.

Да прыватызацыі рыхтуюцца нават ваенныя вытворчасці. Напрыклад, навукова-вытворчае прадпрыемства "КБ Радар", Мінскі электрамеханічны завод, Завод па рамонце радыёэлектроннага ўзбраення ў Барысаве. Канцэрн "Белнафтахім" заявіў пра планы прыватызаваць ужо ў гэтым годзе прадпрыемствы па транспарце нафты — "Гомельтранснафта-Дружба" і наваполацкае прадпрыемства "Дружба".

У спісе таксама шмат птушкафабрык, хлебазаводаў, аўтапаркаў, прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці... Вось толькі дзяржаўныя СМІ ўлада беражэ як "залаты запас" — газеты і тэлеканалы на продаж не выстаўляюцца.

Ігар МАРОЗАЎ.

ДЗІКУНСТВА!

Расправа за іншадумства?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мы вырашылі адрасаваць гэтае пытанне начальніку Упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таісе Данілевіч. Аднак у панядзелак яна адсутнічала на працоўным месцы, знаходзілася, як патлумачыла сакратарка, на выязным выканкаме. Па мабільным тэлефоне Таіса Іванаўна, спасылаючыся на занятасць, прапанавала патэлефанаваць свайму першаму намесніку Мікалаю Куляшу. Ён таксама прысутнічаў на пятнічнай размове з настаўнікамі. Аднак спадар Кулеш ад каментарыя адмовіўся.

— *Вам трэба размаўляць з начальнікам. Такія каментарыі я даваць не магу*, — заўважыў ён.

Паколькі чыноўнікі ад адукацыі Мінаблвыканкама паставілі Наталлю Ільініч у жорсткія рамкі: да серады 20 студзеня яна павінна прыняць рашэнне, "Народная Воля" вырашыла надрукаваць гэты матэрыял, не атрымаўшы каментарый Таісы Данілевіч. Магчыма, газетная публікацыя дазволіць знайсці правільнае выйсце з дадзенай сітуацыі, не стварыць яшчэ адзін ганебны прэцэдэнт у сістэме беларускай адукацыі. Аднак пазіцыю Таісы Данілевіч мы гатовы выслухаць у любы момант і надрукаваць у газеце.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Разам з талькаўскім педагогам Наталляй Ільініч ва ўмовы ганебнага выбару пастаўлены яшчэ пяць настаўнікаў Мінскай вобласці — настаўнік замежнай мовы з Лагойска Мікола ЛЯШЧУН, настаўнікі геаграфіі і фізкультуры з Нясвіжа Уладзімір ПАРЭЙКА і Алесь ЯЗВІНСКІ, а таксама настаўнік фізкультуры Сяргей КЛІМЁНАК з Вілейкі і Надзея АГАФОНАВА з Любані, якая займаецца дэфекталогіяй. Усе яны сябры розных апазіцыйных, але афіцыйна зарэгістраваных партый. Пра іх лёс "Народная Воля" раскажа ў наступных нумарах.

РЭАКЦЫЯ

Партыя БНФ адразу адрэагавала на сітуацыю, якая склалася вакол шасці настаўнікаў Мінскай вобласці. На сайце партыі з'явілася заява, у якой сцвярджаецца:

"Мы ўглядаем у паводзінах Т.Данілевіч відавочнае і дэманстратыўнае парушэнне заканадаўства краіны. Мы бачым прыкметы парушэння:

— арт. 4, 5, 33 і 36 ("Кожны мае права на свабоду аб'яднання") Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі;

— арт. 3 Закона "Аб палітычных партыях" ("Прыналежнасць або непрыналежнасць грамадзяніна не могуць служыць падставай для абмежавання яго ных правоў і свабод");

— арт. 14 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусі ("Дыскрымінацыя, г. зн. абмежаванне ў працоўных правах... у залежнасці ад... палітычных поглядаў, удзелу ці няўдзелу ў прафсаюзах ці іншых грамадскіх аб'яднаннях, ... забараняецца");

— арт. 45 Закона "Аб адукацыі" ("Установа адукацыі нясе... адказнасць за: ... парушэнне правоў і свабод... работнікаў установы адукацыі");

— арт. 194 ("Перашкода законнай дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў") і арт. 199 Крымінальнага кодэкса ("Парушэнне заканадаўства аб працы").

Акрамя таго, звесткі пра партыйную прыналежнасць не фіксуюцца ў працоўным справаводстве і адносяцца да прыватных, г.зн. Т.Данілевіч апервавала незаконна сабранымі звесткамі.

У сувязі з выкладзеным

1. выказваем безумоўную салідарнасць з Наталляй Ільініч, Міколам Лешчуном, усімі настаўнікамі і дэкларуем усемагчымую падтрымку і дапамогу ў абароне іхніх законных правоў;

2. заклікаем іншых настаўнікаў да прафесійнай салідарнасці з калегамі. Гэта асабліва важна напярэдадні кампаніі мясцовых выбараў, калі ўлады збіраюцца зноў выкарыстаць настаўнікаў для запаўнення складу выбарчых камісій і паставіць іх перад выбарам, ці ўдзельнічаць у масавых фальсіфікацыях вынікаў галасавання;

3. лічым падзеі 15 студзеня ў Мінскім абласным упраўленні адукацыі праявай грубага ціску на сяброў дэмакратычных партый як магчымых удзельнікаў мясцовых выбараў. У сувязі з гэтым заяўляем аб заведамай недэмакратычнасці гэтай кампаніі і неадпаведнасці яе стандартам АБСЕ і інфармуем пра гэта кампетэнтныя міжнародныя структуры;

4. Партыя БНФ патрабуе неадкладнага звальнення Т.Данілевіч з пасады загадчыцы Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі за грубае парушэнне педагагічнай і кіраўніцкай этыкі, а таксама ініцыюе зварот у органы пракуратуры з патрабаваннем расследавання фактаў дэманстратыўнага парушэння спадарыняй Данілевіч палажэнняў Канстытуцыі і шэрагу законаў Рэспублікі Беларусь.

КРИМИНАЛ

Дозаправлялся...

Тракторист одного из хойникских предприятий Дмитрий Чумак получил электронную карту для безналичного расчета при заправке на АЗС дизельным топливом и бензином. Соблазн был велик, и при очередной заправке он по сходной цене реализовывал часть горючего частникам-водителям.

И продавец, и покупатель были довольны. Но через месяц выяснилось, что предприимчивый тракторист присвоил и растратил имущества, то есть топлива, почти на миллион рублей. Сотрудницы бухгалтерии вначале схватились за головы, а затем передали материалы ревизии в прокуратуру. Против расхитителя было возбуждено уголовное дело.

Суд Хойникского района не стал отправлять 30-летнего Дмитрия Чумака в места лишения свободы. А вот штраф в два миллиона целковых в доход государства выплатить придется. Да и возместить ущерб предприятию. Кроме того, он лишен права в течение трех лет заниматься деятельностью, связанной с обслуживанием товарно-материальных ценностей. К слову, электронную карту у него отобрали еще до возбуждения уголовного дела.

Валерий КОЗУБОВ.

ПРОБЛЕМА!

Семейное неблагополучие: что к этому ведет?

Исследования проводили специалисты Белгосуниверситета, Института экономики НАН Беларуси, Белорусского государственного педагогического университета совместно с другими организациями. Данные собирались с конца 2007-го до середины 2008 года, в них участвовали белорусские семьи, воспитывающие детей школьного возраста.

Ученые пытались найти причины, из-за которых количество неблагополучных семей в стране постоянно растет. Специалисты проводили исследования о составе семей, отношении подростков к браку и другим факторам, которые влияют на демографическую ситуацию в стране.

Стоит отметить, что неблагополучная семья — не значит неполная или асоциальная. *"Старшеклассники — участники наших опросов жаловались на то, что отцы, даже в полных семьях, уделяют им мало внимания,* — рассказывает доктор социологических наук **Александра Воднева**. — *После опроса выяснилось, что 20 процентов школьников общаются с отцами менее одного часа в день".*

Проведя исследования, ученые пришли к неутешительным выводам. Уровень рождаемости в нашей стране — один из самых низких в мире. Ситуацию усугубляют пьянство, алкоголизм и наркомания. В Беларуси растет число так называемых алкогольных психозов. Особенно страдают от этого женщины. Растет число наркозависимых. За последние шесть лет количество наркоманов в Беларуси увеличилось на 41,4 процента.

Злоупотребление алкоголем и прием наркотиков влияют и на психическое состояние белорусов. С 90-х годов прошлого века отмечается рост числа психических расстройств. При этом социологи отмечают, что здоровый образ жизни — не гарантия психологического равновесия. Причинами расстройств специалисты называют стресс, неуверенность в завтрашнем дне и другое.

В свете этих данных необычно выглядит заключение экспертов о том, что "слабая" половина человечества берет на себя обязательства "сильной". Ученые отметили, что с каждым годом в Беларуси роль женщины — главы семьи увеличивается. Мужчины сдают свои позиции, их роль в воспитании детей в большинстве случаев незначительна.

"Возрастающая социальная роль женщин в жизни семьи не значит, что семья может обойтись без отца, — заверила координатор проекта **Светлана Бурова**. — *Большинство опрошенных заявило, что залог благополучия в семье — это заботливый мужчина, отец".*

И при этом матери гораздо ответственнее и реалистичнее относятся к воспитанию детей, чем сильная половина человечества. Женщины меньше балуют детей и заботятся о более разностороннем развитии.

Серьезнее дамы относятся и к финансовому вопросу. Материальная обеспеченность может стать главным фактором спокойствия в семье, убеждены социологи. В то же время в погоне за деньгами родители часто забывают о своих детях или не могут создать ту семью, о которой мечтали. Большинство городских детей (92,5 процента) из-за занятости родителей посещают детские сады и другие учреждения.

Учитывая все факторы, белорусские специалисты сетуют на правительство. По данным ученых, работа госорганов в социальной сфере неэффективна. Особенно страдает популяризация семейных идей. Из-за недостатка специального воспитания в школе у молодых людей складывается идеализированное представление о браке и брачном партнере. При этом 22,3 процента юношей и девушек одобряют гражданские браки, а большинство хочет создать семью.

Составители отчета об исследовании причин семейного неблагополучия в Беларуси рекомендуют властям обратить внимание на их выводы. По мнению ученых, стране необходим специализированный научный центр изучения семьи, нужно прививать семейные ценности в школе, со страниц газет и с телеэкранов и многое другое.

Мария МАЛЕВИЧ.

ВАКОЛ ПЕНСІЙ

Хто з'еў «падарунак»?

Новы год пачаўся з прэзідэнцкага ўказа аб павышэнні ўсіх відаў пенсій у сярэднім на 9 працэнтаў. Здаецца, ёсць падстава для радасці. Але радавацца не выпадае. Бо чарговая дабаўка ў межах 40—50 тысяч рублёў адразу ж будзе з'едзена няўмольна ўзлятаючымі цэнамі. Ужо з'ядаецца. Нездарма, што год Тыгра...

Першымі паднеслі сюрпрыз камунальшчыкі. Дастаткова глянуць у так званыя жыроўкі за снежань, каб пабачыць, што кошт жылля, у залежнасці ад яго памераў, павысіўся на 15—30 тысяч рублёў. Пры тым што тарыфы не змяніліся, у прыватнасці, тарыфы на ацяпленне. Камунальшчыкі спасылаюцца на вельмі моцныя снежаньскія маразы. Так, гэта праўда. Толькі я не думаю, што менавіта маразы з'елі прэзідэнцкі "падарунак".

Зойдзем у пяціпавярховы дом №39 па вуліцы Камсамольскай г. Фаніпаля. У большасці кватэр тэмпература не перавышае 15—17 градусаў. Таму што напярэдадні ацяпляльнага сезона камунальшчыкі не прамылі батарэі і трубы. І так званыя паветраныя пробкі перашкаджаюць нармальнай цыркуляцыі гарачай вады. Жыхары дома, у якім, дарэчы, жыву і я, неаднаразова звярталіся да кіраўніцтва ЖКГ, каб яно ліквідавала недахопы, але атрымлівалі толькі фармальныя адпіскі. Дык хто ж вінаваты ў тым, што на ацяпленне трацяцца вялікія грошы, а чакаемага цяпла, па сутнасці, няма?!

Але сапраўдная цэнавая вакханалія адбываецца ў аптэках, як дзяржаўных, так і камерцыйных. Рост цэн на лекі проста астранамічны.

Мой сусед, ветэран працы Іван Пятровіч, які адпрацаваў на Фаніпальскім ЖБМК больш за 40 гадоў і пакутуе на захворванне каленных суставаў (артрыт), кажа, што адносна недарагія беларускія прэпараты не дапамагаюць, а імпартныя не па кішэні. Напрыклад, французскі "Скрыптум" каштуе 120 тысяч рублёў, кожная ампула больш за дзве тысячы. Дзесяць ампул румынскага "Алфлутона" — 117 тысяч. Курс лячэння — 20 ампул.

— Ужо больш за дзесяць гадоў нічога з адзення не купляю, — працягвае Іван Пятровіч. — Знасіліся чаравікі, кашулі, майкі... Не хапае грошай на самае надзённае — пральны парашок, мыла, зубную пасту... З даўгоў не вылажу, хоць кінуў курыць і з чаркай не сябрую...

— Няўжо, — пытаюся, — за сорак год працы нічога не адклаў на старасць?

— Адклаў. Каля шасці тысяч савецкіх рублёў трымаў на ашчаднай кніжцы, на той час каля 5—6 тысяч долараў. Спачатку дзяржава гарантавала іх захаванне, потым Аляксандр Лукашэнка, калі першы раз ішоў на прэзідэнцкія выбары, абяцаў, што верне іх. Калі не грашыма, дык рознымі на той час дэфіцытнымі рэчамі. Ды толькі добрыя намеры засталіся на паперы...

Кожную раніцу можна бачыць, як спяшаюцца на фаніпальскі міні-рынак вяскоўцы са сваім сялянскім таварам — смятанай, малаком, бульбай... Але могуць і не спяшацца, бо пакупнікоў становіцца ўсё менш.

Аднойчы і мой сусед Іван Пятровіч вырашыў прыдбаць нейкую капейчыну да свайго бюджэту. Хтосьці сказаў яму, што ў Мінску ў букіністычным магазіне прымаюць на продаж кнігі. Хадзіў ён, хадзіў уздоўж полак, але так нічога і не знайшоў сярод кніг, якія збіраў усё жыццё...

Потым я сустракаў яго радасным ад таго, што не здрадзіў "сваім сябрам", як называў кнігі яшчэ Пушкін.

Але гэта была сумная радасць.

Анатоль ШАРАЕЎ,
ветэран працы.

г.Фаніпаль Дзяржынскага раёна.

ЛАБИРИНТ

Отдайте мой огород!



Уважаемая редакция!

Помогите мне восстановить истину и справедливость. Мой отец еще в 1938 году вступил в колхоз, а для ведения подсобного хозяйства получил земельный участок с правом пожизненного наследуемого владения. На этом участке стоит дом, есть и другие постройки. Когда отца не стало, дом перешел по наследству мне. И тоже с правом пожизненного наследственного владения земельным участком.

Но вот пришли какие-то недоросли и забрали мой огород без моего согласия и решения суда. А мне предлагают землю в поле за несколько километров от дома. Вот что ответил райисполком на мое обращение: *"Городецкий сельисполком имеет возможность предоставить Вам свободный земельный участок для ведения личного подсобного хозяйства в другом месте"*. Зачем мне "в другом месте", когда у меня есть свой законный огород? Мне ведь 80 лет, я пережила страшную войну, голод, холод, а сейчас по милости чиновников вынуждена переживать их издевательство и незаконность. Я даже не знаю, кто такой Гончаров, которому отдали мой огород, откуда он взялся. И почему чиновники сеют вражду между соседями, которая останется нашим детям?

Мария МЕНЩИКОВА.
д.Городец
Шкловского района.

ОТ РЕДАКЦИИ

К письму приложен еще один ответ нашей читательнице за подписью С. Шкредова — заместителя руководителя Могилевской областной землеустроительной и геодезической службы. Из ответа вытекает, что участок, "примыкающий" к земельному участку Менщиковой, был закреплен за упомянутым и неведомым ей Гончаровым в 1996 году. И только в 2007 году перешел ему "в пожизненное наследуемое владение по фактически сложившимся границам". Надеемся, в том, как "фактически" складывались эти границы, разберется прокуратура Могилевской области. И о результатах разбирательства сообщит редакции и Марии Кузьминичне Менщиковой.

ВОДГУК

Балюча, але незваротна

Паважаная рэдакцыя!

Яшчэ з восені, дакладней з 30 кастрычніка, калі вы надрукавалі ліст З. Янкоўскага пад назвай "Приехал я на родину", непакояць мяне выказаныя ім пачуцці і думкі.

Мне таксама далёка за 70 гадоў, я таксама наведваю родныя мясціны, нават часткова дажываю там свой век, і бачу, як пусцее вёска. У мяне і маіх сяброў такі ж боль за апусцеўшыя вёскі, за наш родны кут. Але мы добра разумеем, што аднавіць вёскі ў тым выглядзе, які мы запомнілі з дзяцінства, ужо немагчыма.

Што тут казаць? Балюча, але незваротна...

Ніхто ўжо не будзе гаспадарыць на зямлі з дапамогай коннага плуга, касіць траву ручной касой, жаць збожжа сярпом. Нават на прысядзібных агародах зрэдку гэта пабачыш. Цяпер адзін трактар апрацуе больш зямлі, чым некалі цэлая вёска.

Карацей кажучы, урбанізацыю так бы мовіць вёскі ўжо не спыніш. І нельга так ужо негатыўна ставіцца да аграгарадкоў. Будуць і ў іх сады, і жыць у іх будуць не толькі "перакаці-поле", але і добрыя старанныя людзі. Калі, канешне, гарадок будуецца без цеснаты, з разлікам на будучыню, зыходзячы з рэальнай патрэбнасці ў памерах вытворчасці і ў рабочых руках. А не так, як можна бачыць зараз — адным хуткім наскокам.

І яшчэ пра адно пытанне, закранутае ў лісце З.Янкоўскага — аб так званай "ахове прыроды". Ахоўваць трэба, але не так, як гэта робіцца зараз. Бо тыя, хто вынішчае ўсё жывое электравудамі ці вынішчае ўсю рыбу ў зімавальных ямах, часцей за ўсё застаюцца па-за зрокам аховы. А ловяць і штрафуюць тых, хто бясшкодна злавіў пару рыбін на сваю патрэбу. І так будзе, пакуль ацэньваць ахоўніцкую дзейнасць будуць па колькасці затрыманых.

На мой погляд, трэба ў абавязкі аховы ўвесці не толькі карныя функцыі, але і адказнасць за непасрэдны ўдзел у выратаванні прыроды. Колькі гіне той жа рыбы, калі здараецца так званы замор — у нас кажуць "тхло"... Што, нельга арганізаваць людзей на тое, каб прарэзалі піламі вокны ў лёдзе? Лічу, што менавіта такая ці падобная праца павінна быць асноўнай у тых, хто адказвае за ахову прыроды. А не толькі справаздачы аб колькасці затрыманых ды аштрафаваных...

Т.РАТУШАВА.

Віцебск.

Хороша дипломатия!

Открытое письмо послу Российской Федерации в Республике Беларусь Александру Сурикову

Г-н посол!

Прочитал в газете "Народная Воля" за 24—28 декабря 2009 года ваши ответы на вопросы журналистов. И у меня, простого белорусского пенсионера, появились свои вопросы.

Вы заявляете: "И тогда появятся и политики, уже не оппозиционные, а просто демократические".

По-вашему, оппозиционер не может быть демократом? Что, Виктор Гончар и Юрий Захаренко не были демократами? Призывали к анархии или силовым действиям против власти? И где они? Просто исчезли, потому что боролись с тоталитарным режимом демократическими методами, с тем, что вы сами одобрительно называете "жесткими рычагами", считая, что без лукашенковских "жестких рычагов" нельзя было "вытащить" Беларусь "из ямы"...

В.Путин, несмотря на вопли подхалимов, не пошел вопреки Конституции на третий президентский срок. Такого же мнения придерживается, по-моему, и Д.Медведев. Но почему они, и вы, г-н посол, не осуждаете Лукашенко за стремление к пожизненному правлению? Вы скажете, что это не дело дипломатов — осуждать правителей стран, где они служат. Может быть. Но разве дело дипломатов — публично осуждать противников этих правителей?

"Им наплевать на все: на народ, на государство...", "Не нравится жесткость, тоталитарность власти..." — это вы про белорусскую оппозицию.

А вам это нравится? Нравится, что у нас бесследно исчезают оппозиционные лидеры? Что избивают людей на митингах или исподтишка в подъездах? Нравится, что хватают на улицах, вывозят за город и бросают на морозе в лесу?

Нет, не Беларусь вам нравится, г-н посол, и не белорусский народ. Вам нравится Лукашенко. И не нравится "заточенность" против него оппозиции и большинства, уверен, жителей Беларуси. И вы прекрасно знаете об этом. Как знаете и о том, что "массы", на которых вы ссылаетесь, запуганы, не имеют правдивой информации, а оппозиция слабая, потому что избита, оклеветана и "жесткими рычагами" оторвана от народа.

Все это вы знаете, в том числе и как дипломат. Но свое мнение об оппозиции составляете, "пересекаясь", по вашему признанию, с ней на приемах.

Хороша дипломатия!

О. ВАЛЕВИЧ.

г.Барань Витебской области.

ІНШЫ ПОГЛЯД

Цвёрда трымаўся юнак...

У першым нумары "Народнай Волі" за 5 студзеня пад рубрыкай "Погляд" і назвай "Як завяжаш гальштук..." быў надрукаваны ліст актыўнай аўтаркі старонкі "Пошта" Валянціны Пажылавай з Светлагорска — аб неабходнасці з павагай ставіцца да савецкага мінулага, яго сімвалаў і правадыроў. Тады ж мы выказалі ўпэўненасць, што такі спрэчны погляд выклікае мноства альтэрнатыўных водгукаў. І не памыліліся. Сёння друкуем адзін з самых цікавых.

Спадарыня Пажылава! Я таксама нямала пажыў на гэтым свеце. Паслухайце ж і вы мяне.

"Цвёрда трымаўся юнак на дапросе..." — вы помніце гэты куляшоўскі радок, а я памятаю ўвесь верш. Бо з ім звязана нешта для мяне істотнае, знакавае.

Аднойчы я паўтарыў гэты верш дома, каб назаўтра атрымаць "пяцёрку". Мама слухала, слухала маю дэкламацыю, а вечарам, калі я ўсё ўжо вывучыў, расказала мне адну гісторыю.

У студзені 1943 года было вельмі холадна. І змерзлыя партызаны павылазілі з лесу і рассяліліся па вёсках. Але ваенных дзеянняў не прыпынялі, за што тыя вёскі праз некалькі дзён і спалілі фашысты. Спалілі разам з малымі і старымі, спалілі ўсіх, хто не паспеў уцячы ў лес. Але зараз размова не пра тое.

У хаце, дзе жыла маці з трыма дзецьмі, таксама спыніліся партызаны. Хата была падзелена на дзве часткі фіранкай. Аднойчы маці нешта шыла за фіранкай, а ў другой палове засядаў камсамольскі штаб: прымалі ў камсамол двух хлопцаў. Адзін адразу напісаў заяву, а другі адмаўляўся, як яго ні ўгаворвалі. У хату зайшоў камандзір атрада і яму сказалі: вось гэты не хоча пісаць заяву.

— Што, гад! Хочаш немцам прадацца, як прыйдуць?! — ашчэрыўся камандзір.

— Не, — спакойна адазваўся хлопец, — немцам я прадавацца не збіраюся, але і ў камсамол не хочу.

— Не напіша — расстраляць! — грымнуў камандзір і пайшоў. У маці затрэсліся рукі. Яна адклала шыццё і стала слухаць, што будзе далей. Усталявалася цішыня, такая цішыня, ад якой звініць у вушах. Потым нехта сказаў:

— Пішы...

І зноў цішыня.

— Тады хадзем.

Усе ўсталі і пайшлі...

Маці не ведала, што сталася з тым хлопцам далей. Вясковыя людзі ўжо прывыклі, што распытваць аб чым-небудзь небяспечна, цікаўныя ў тыя часы нядоўга жылі. Але прозвішча хлопца запомніла: Паланейчык.

Расказаўшы мне тую гісторыю, маці глянула ў мае збянтэжаныя вочы і схамянулася:

— Ты ж, сынок, хаця пра тое нікому не расказвай!

Доўга не расказваў. Але час ад часу параўноўваў тое, што таленавіта сачыніў Куляшоў, і жыццёвую праўду, расказаную мне нябожчыцай-матуляй.

Спадарыня Валянціна! Ваша і многіх вашых сучаснікаў бяда ў тым, што вас выгадавалі на хлусні, таленавіта апрацаванай некаторымі пісьменнікамі. Парэшткі ж тых, хто не хацеў дапамагаць хлусні, трэба шукаць у шматлікіх савецкіх курапатах. Яна, тая хлусня, прарасла ў вас і стала вашай скурай. Здзіраць гэтую скуру з сябе сапраўды балюча. Спачуваю.

Спытаеце: чаму ж я, чалавек прыблізна вашага веку, не ўспрыняў тую хлусню? Успрыняў (тую "пяцёрку" ўсё ж зарабіў), але потым доўга здзіраў, і дагэтуль здзіраю. Толькі мне тое было крыху лягчэй, чым вам, бо ў мяне яна прарасла не так глыбока. Уратаваў роздум аб лёсе бацькі, аднаго з мільёнаў, што прайшлі сцежкамі ГУЛАГу. Савецкая ўлада знаходзіла "шпіёнаў" нават у глухіх вёсачках, схаваных сярод балот. У вашай сям'і такіх не было? Лічыце, што вам неяк пашанцавала. Таму вам так цяжка зараз.

Міхась БУЛАВАЦКІ,
настаўнік, 62 гады.

Магілёў.

НАМ ОТВЕЧАЮТ

«Постановление отменено»

"В прокуратуре г. Минска рассмотрено поступившее 30.12.2009 из редакции газеты "Народная Воля" обращение Чорнокозинецкого В.Ф.

...Установлено, что Чорнокозинецкий В.Ф. 30.05.2008 обратился в Фрунзенское РУВД г. Минска с заявлением о привлечении к ответственности работников НПО "Центр" за причинение телесных повреждений 29.12.2001, 04.03.2005 и 19.01.2006, а также за хищение имущества. Несмотря на давность указанных заявителем событий и несвоевременность его обращения в органы внутренних дел в ходе проверки ряд указанных... доводов о причинении телесных повреждений нашли свое подтверждение. Вместе с тем проверка Фрунзенским РУВД проведена поверхностно, и ряд приведенных заявителем доводов не проверен... 05.06.2009 Фрунзенским РУВД вынесено постановление об отказе в возбуждении уголовного дела.

В связи с неполнотой проведенной проверки прокуратурой города Минска 28.12.2009 указанное постановление отменено и материалы направлены в Фрунзенское РУВД для проведения дополнительной проверки и принятия законного и обоснованного решения...

Ход проведения проверки по заявлению Чорнокозинецкого В.Ф. взят на контроль прокуратурой города Минска.

Начальник отдела
по надзору за дознанием
А.В. Бычков".

З ПОШТЫ ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА

Каб помнілі

Добры дзень, паважаны Іосіф Паўлавіч!

Не маглі да вас датэлефанавацца, калі Вы напрыканцы мінулага года адказвалі на пытанні чытачоў па "Прамой лініі". Таму пішам гэты ліст.

Якіх-небудзь асаблівых прапаноў у нас няма, газета насамрэч вельмі змястоўная. Вось толькі, калі ласка, працягвайце зноў і зноў друкаваць інфармацыю аб зніклых палітыках і журналісце, каб мы ўсе помнілі аб іх і ўшаноўвалі іх памяць. І каб тыя, хто здзейсніў гэтыя дзікунскія злачынствы, жылі ў пастаянным страху і ведалі, што іх пакарае і Божы суд, і суд нашага народа.

Моцнага Вам здароўя, шчасця, поспехаў і мужнасці.

Тамара Іванаўна
і Піліп Іванавіч
САКСОНАВЫ.

в.Ракушава Круглянскага раёна.

ДЗЯКУЙ!

«Пасаджу я на зямлі сады вясення»

На здымку маленькі саджанец-пруток гадавалай яблынькі амаль і не разгледзіш. Дакладней, не разгледзіць звычайны чалавек. А гэтая незвычайная жанчына ўжо зараз уяўляе будучае дрэва ў раскошнай вясновай квецені, у восеньскі час — у гірляндах чырвонабокіх яблык.

Колькі садоў — і не толькі садоў — пасадзіла і вырасціла на сваім вяку кандыдат біялагічных навук Вера Трафімаўна Сідзенка! Не для сябе адной — для ўсіх. Апошні яе "твор", здзейснены разам з Галінай Аляксееўнай Коваль, Валерыем Аўсенцьевічам Мацвеевым і іншымі аднадумцамі, — цудоўны сад на сталічнай вуліцы Прытыцкага, ля царквы Святой Еўфрасінні Полацкай. Там, у атачэнні яблынь, ігруш, сліў, айвы растуць-цвітуць нават неверагоднай красы японскія вішні — сакуры, якія прыжыліся на лапіку беларускай зямлі дзякуючы ёй, яе ведам, клопату і любові.

Помню, як толькі задумваўся гэты сад на пустыры з рэшткамі будаўнічага друзу, стваральная энергія гэтай руплівіцы раскатурхала многіх жыхароў мікрараёна і прыхаджан царквы. На дапамогу добрай справе прыходзілі цэлымі сем'ямі, — з бацькамі, бабулямі і дзядулямі — малыя дзеткі. Яны раслі разам з дрэўцамі, вучыліся дзейснай любові да прыроды і, верыцца, і надалей захаваюць для сябе і сваіх будучых дзетак гэтую навуку. Так што любімая мая і яе песня "Пасаджу я на зямлі сады вясення, зацвітуць яны ва ўсёй красе" — гэта зусім не толькі паэтычная формула, а сапраўдны дэвіз жыцця яркага чалавека.

Шмат гадоў прысвяціла Вера Трафімаўна ўдумнай і карпатлівай працы, каб беларуская зямля была больш урадлівай і шчодрай. Калісьці, яшчэ ў 60-я гады мінулага веку, тагачасны галоўны аграном абласнога ўпраўлення Міністэрства сельскай гаспадаркі кінула горад, утульны рабочы кабінет і паехала на вёску, каб канкрэтнай практычнай працай, а не папяровымі павучаннямі ўвасабляць сваю мару ў рэальнасць. Сэрца яе заходзілася ад болю, калі бачыла: пасля цяжкой працы на калгасным полі стомленыя жанчыны прысаджваліся "абедаць", а ў разгорнутых вузельчыках было пару бульбін, цыбуліна, бутэлька з малаком ці квасам — і ні акрайчыка хлеба...

Разумела, як гэта несправядліва: такія працавітыя людзі, а "плацяць" ім аднымі "палачкамі", трымаюць, бы ў прыгоне, без правоў і пашпартоў, без зацікаўленасці ў выніках сваёй працы. Таму і імкнецца моладзь любымі праўдамі-няпраўдамі вырвацца адтуль, з'ехаць у горад. Як жа захаваць беларускую вёску, зрабіць яе крыніцай багацця і радасці?

У гады перабудовы аўтарытэтны вучоны-аграрнік Вера Сідзенка актыўна выступала ў друку і на сустрэчах з грамадскасцю, звярталася да дэпутатаў Вярхоўнага Савета, з тым каб рыхтаваць грамадскую думку і матэрыяльныя перадумовы для рашучых перамен на вёсцы, прыняцця закона аб прыватнай уласнасці на зямлю, як гэта дзеецца ў цывілізаваным свеце. Такім шляхам можна было б вярнуць зямлі гаспадара, пераканана яна.

Не атрымалася пераканаць, не саспеў той, яшчэ камуністычны, парламент, да "замаху на святое". Вось і пусцее дагэтуль вёска, многія паселішчы зусім знікаюць са знікненнем былых жыхароў...

Але што мне асабліва падабаецца ў характары Веры Трафімаўны: яна ніколі не паддаецца роспачы, свае выкрышталізаваныя багатай практыкай і жывым розумам перакананні не здае ў архіў, як некаторыя: маўляў, што паробіш, вышэй галавы не скокнеш. Тое, у што верыць, чым даражыць, і зараз, у свае 80, адстойвае з важкай аргументацыяй і маладой гарачнасцю. Ну, узяць хоць бы важнейшае для беларусаў пытанне аб нацыянальнай мове. Украінка па нараджэнні, Вера Трафімаўна тым не менш гарой стаіць за беларускую мову як адзіную дзяржаўную, лічыць, што без яе няма Беларусі. Гэтак жа настойліва даказвае апанентам, што наша краіна павінна як святыню берагчы сваю незалежнасць, жывучы ў сяброўстве з усім светам, і не трэба ёй ніякіх "саюзаў" — з Расіяй ці з кім яшчэ. Слушна даказвае: калі палымяныя змагары за "Саюз" шчырыя, то чаму тады самі не хочуць жыць пад адным дахам, у вялікім сямейным "саюзе" з дарослымі дзецьмі, унукамі, братамі, сваякамі? Чамусьці са скуры вылузваюцца, каб забяспечыць кожнага асобнымі кватэрамі? Яна бачыць Беларусь шчаслівай, вольнай, дэмакратычнай дзяржавай.

Усё, што адбываецца ў краіне і на планеце, з блізкімі і проста знаёмымі людзьмі, глыбока хвалюе неабыякавую жанчыну. А яшчэ тонкую, адчувальную душу захапляе хараство ва ўсіх яго праявах — ці то ў чалавеку, ці то ў прыродзе, ці то ў мастацтве. Яе можна часта бачыць у тэатральнай зале, на канцэртах вядомых творчых калектываў і сімфанічнай музыкі. І не толькі таму, што яе муж Анатоль Іосіфавіч Каландзёнак, які, на жаль, нядаўна пайшоў з жыцця, у свой час быў дырэктарам Белдзяржфілармоніі і шмат зрабіў, каб даць шырокую дарогу і "Песнярам", і харэаграфічнаму ансамблю "Харошкі", і іншым выдатным артыстам. Галоўнае — таму, што прыгожае дае сілы жыць і радавацца жыццю насуперак нягодам, хваробам, цяжару гадоў.

Вядома, чалавек адбыўся, калі пабудаваў дом, пасадзіў сад, вырасціў сына. Вера Трафімаўна Сідзенка вырасціла вялікі сад дабрыні і святла, выгадавала разам з мужам двух сыноў і чацвёра ўнукаў, а як таленавіты навуковец — маладых паслядоўнікаў для навукі аб зямлі. Бог даў ёй вялікі шчодры дар — і яна аддае яго спаўна людзям цеплынёй сваіх рук і сэрца.

Будзь жа вечна маладой і шчаслівай, мая дарагая сяброўка, і не зважай на тое, як хутка бягуць гады, бы ручайкі да паўнаводнай ракі. З 80-гадовым юбілеем, мілая Верачка, жанчына з імем, якое ёй так пасуе! Твая вера ў будучыню нашай любай Беларусі запальвае сэрцы іншых людзей. Дзякуй, што ты ёсць!

З павагай —

Таіса САК,
пастаянная падпісчыца
і аднадумца
"Народнай Волі".

Мінск.

Народная воля
http://www.nv-online.info
19—21 СТУДЗЕНЯ 2010 г.

ДИПКУРЬЕР

Посол Великобритании Розмари ТОМАС:

«Здоровой демократии нужна работающая оппозиция»

Три месяца назад в Беларуси приступила к работе новый Чрезвычайный и Полномочный посол Великобритании г-жа Розмари ТОМАС. Это интервью в духе неформального общения для читателей "Народной Воли" она дала на русском языке.

— Говорят, в Англии, в хорошем обществе любой серьезный разговор принято начинать вопросами о погоде. Наша погода, вернее постоянная белорусская непогода, вас еще не испугала, госпожа посол?

— Я привыкла к холодам, потому что раньше работала в Украине, а там тоже бывали сильные морозы. Вы правы, англичане всегда обсуждают погоду — мы ведь живем на острове в Атлантическом океане, в условиях четырех разных погодных систем. Именно поэтому наша погода самая изменчивая в мире. Мы всегда говорим, что у нас нет климата — просто погода.

— А теперь, если позволите, о насущных политических проблемах. Как вы считаете, насколько эффективным вам видится решение Евросоюза продлить приостановку санкций в отношении белорусских чиновников до октября 2010 года?

— Нам кажется, что другого выбора не было. Мы искренне надеялись, что отмена санкций станет полностью возможна, но, к сожалению, мы не смогли найти достаточно признаков прогресса в области политической либерализации. Но мы начинаем новый год с новыми надеждами и убеждены, что есть возможность далее развивать наши отношения в рамках "Восточного партнерства", декларация о котором была подписана в прошлом году в Праге.

— Как вы оцениваете деятельность белорусской оппозиции на данном этапе?

— Я должна подчеркнуть, что Евросоюз не оказывает поддержку каким-либо отдельным партиям и движениям. Однако мы поддерживаем принцип, согласно которому любой здоровой демократии нужна работающая оппозиция. Вот поэтому мы интересуемся вопросами регистрации политических партий и других организаций здесь, в Беларуси.

